*Магалінскі І. У.* DOI: https://doi.org/10.52275/PM2024-74-76

УДК 902.2:739

*І. У. Магалінскі*

# КРЫЖАПАДОБНАЯ ПАДВЕСКА «СКАНДЫНАЎСКАГА» ТЫПУ З ДАСЛЕДАВАННЯЎ 2020 г. НА ВЕРХНІМ ЗАМКУ ПОЛАЦКА

*Прадстаўлены вынікі вывучэння сярэбранай крыжападобнай падвескі «скандынаўскага» тыпу, якая паходзіць з матэрыялаў археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка Полацка. Адзначана, што падобныя прадметы з'уляюцца ў X—XI стст., а іх бытаванне трэба звязваць з элітарнай дружыннай культурай. Робіцца выснова, што знаходку першага ў Беларусі вялікага сярэбранага крыжа «скандынаўскага» тыпу на Верхнім замку Полацка трэба лічыць прыкметай прысутнасці тут у X—XI стст. княжацкай дружыны, магчыма, скандынаўскага паходжання.*

***Ключавыя словы:*** *ювелірнае рамяство, вырабы з каляровых металаў, матэрыяльная культура, археалогія Полацка.*

Маштабныя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Верхняга замка Полацка, звязаныя з рэканструкцыяй былых карпусоў гарадской бальніцы пад кадэцкае вучылішча, распачаліся ў 2018 г. і працягваюцца па цяперашні час. Помнік археалогіі «Верхні замак» размешчаны ў межах гістарычнага цэнтра г. Полацка і ўваходзіць у Дзяржспіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, у сувязі з чым любыя земляныя работы на помніку патрабуюць археалагічнага суправаджэння [3, с. 48—49].

Зімой 2020 г. праводзіліся працы па ўмацаванні падмуркаў харчблока (былы будынак скурна-венералагічнага дыспансера). Працы на аб'екце ажыццяўляліся ўручную і ўяўлялі сабой серыю шурфаў уздоўж сцен з унутранага і вонкавага бакоў будынка. У сувязі са спецыфікай фарміравання слоя ў месцы прымыкання да сцен на большасці ўчасткаў культурны слой знаходзіўся ў пераадкладзеным стане.

Падчас распрацоўкі шурфа каля паўднёвай сцяны аднапавярховай часткі будынка харчблока быў выяўлены моцнакаразіраваны артэфакт, які ў ходзе першаснай ачысткі выявіўся цэлым экзэмплярам крыжападобнай падвескі так званага «скандынаўскага» тыпу, які падчас далейшай рэстаўрацыі разваліўся на дзве часткі (*малюнак 1*).




**Малюнак 1 — Падвеска «скандынаўскага» тыпу з Верхняга замка Полацка**

Прадмет плоскі, аднабаковы, роўнаканечны, з рэльефным арнаментам, з дротавым вушкам для падвешвання. Падвеска адліта з нізкапробнага серабра з істотнымі дамешкамі медзі, а вушка зроблена з двухкампанентнага высокапробнага серабра (*табліца 1*)*.

---

*Даследаванне хімічнага складу прадмета праводзілася ў археалагічнай лабараторыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта аўтарам артыкула па метаду безэталоннага рэнтгенафлуарэсцэнтнага аналізу на партатыўным РФА-спектрометры Vanta C.

*Магалінскі І. У.* DOI: https://doi.org/10.52275/PM2024-74-76

Табліца 1 — Хімічны склад падвескі «скандынаўскага» тыпу з Верхняга замка Полацка

| Проба | Ag | Cu | Pb | Sn | Au | Bi | Sb |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аснова | 59,28 | 35,34 | 0,79 | 0,33 | 0,39 | 0,28 | 0,37 |
| Вушка | 86,78 | 7,21 | 0,5 | – | 1,66 | 0,23 | – |

Назва падвесак абумоўлена гістарыяграфічнай традыцыяй, якая бярэ пачатак у працах А. А. Спіцына. На момант даследавання дадзенай групы артэфактаў яму былі больш вядомыя скандынаўскія знаходкі прадметаў гэтага тыпу [4, с. 234]. Думку пра паходжанне артэфактаў з тэрыторыі Паўночна-Заходняй Русі і Прыбалтыкі выказала М. В. Фехнер, якая вывучыла 69 экзэмпляраў вядомых на той час крыжоў, знойдзеных у 32 пунктах [5, с. 214]. На сённяшні дзень колькасць выяўленых падвесак дадзенай групы істотна павялічылася, што дазваляе даследчыкам больш поўна ўявіць агульную карціну распаўсюджвання артэфактаў, а таксама ўстанавіць іх паходжанне.

Полацкую знаходку магчыма аднесці да групы І па тыпалогіі А. Ю. Чураковай, якая аб'ядноўвае сярэбраныя крыжы, упрыгожаныя трыма кружочкамі на канцах кожнай лопасці, самі лопасці пакрыты кропкавым ці лінейным арнаментам, а ў сяродкрыжжы прысутнічае круг, упрыгожаны дадатковымі элементамі ці простымі лініямі. Даследчыца адзначае, што такія крыжы звычайна звязаны з багатымі пахаваннямі ці знойдзены ў культурных напластаваннях буйных паселішчаў. Усяго на сёння вядома 16 знаходак крыжоў групы І, якія паходзяць з 13 пунктаў [6, с. 160].

Блізкія аналогіі полацкай знаходцы паходзяць з Сярэдняга Падняпроўя (курган каля в. Весь Кіеўскай вобласці) і Готланда. Пры гэтым знаходкі крыжоў «скандынаўскага» тыпу с Сярэдняга Падняпроўя адзінкавыя [5, с. 215]. Неабходна таксама адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі не выяўлена дакладных аналогій полацкай знаходцы [1, с. 18].

Паходжанне крыжападобных падвесак «скандынаўскага» тыпу традыцыйна звязваюць з тэрыторыяй Старажытнай Русі ў сувязі з тым, што большая частка вядомых на час публікацый знаходак паходзілі з гэтага рэгіёна. Дадатковым сведчаннем дадзенай тэорыі з'яўлялася выяўленне ў Кіеве ліцейнай формы для вытворчасці такіх прадметаў, якая, аднак, выкарыстоўвалася для адлівак пазнейшых копій крыжоў з меднага сплаву [2, с. 372].

У цяперашні час устаноўлена, што вялікія сярэбраныя крыжападобныя падвескі «скандынаўскага» тыпу групы І, звязаныя з дружыннай элітарнай культурай, з'яўляюцца ў канцы Х—ХІ стст. і прысутнічаюць як на тэрыторыі Старажытнай Русі, так і Скандынавіі практычна ў роўнай колькасці. Некаторыя даследчыкі нават бачаць у арнаментыцы такіх крыжоў выяўленчыя элементы, уласцівыя скандынаўскай традыцыі. Аднак у большасці не выклікае сумнення, што раннія тыпы крыжоў маюць усходне-хрысціянскае паходжанне і ў выніку папулярнасці салярнай кампазіцыі атрымалі распаўсюджанне на вялікай тэрыторыі, спалучыўшы розныя культурныя традыцыі [6, с. 168].

Такім чынам, знаходка ў Полацку на Верхнім замку першага ў Беларусі вялікага сярэбранага крыжа «скандынаўскага» тыпу трэба лічыць прыкметай прысутнасці тут у Х—ХІ стст. княжацкай дружыны, магчыма, скандынаўскага паходжання.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Башков, А. А. Христианские древности Беларуси конца X—XIV вв. (предметы христианского культа индивидуального использования) / А. А. Башков. — Минск : И. П. Логинов, 2011. — 194 с.

2. Зоценко, В. Н. Бронзовая литейная форма XI в. из Киева / В. Н. Зоценко, М. М. Иевлев // Славяно-русское ювелирное дело и его истоки : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 100-лет. со дня рожд. Галины Фёдоровны Корзухиной, С.-Петерб., 10—16 апр. 2006 г. / ред. А. А. Пескова, О. А. Щеглова, А. Е. Мусин. — СПб. : Нестор-История, 2010. — С. 371—374.

*Магалінскі І. У.* DOI: https://doi.org/10.52275/PM2024-74-76

3. Левко, О. Н. Начальный этап новых исследований Верхнего замка Полоцка (2018—2020 гг.) / О. Н. Левко, И. В. Магалинский, П. М. Кенько, А. Л. Коц, В. В. Черевко, А. А. Соловьев, Л. Г. Калбеко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15—16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. А. І. Корсак (адк. рэд.), В. У. Чараўко, У. Я. Аўсейчыка. — Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. — С. 48—60.

4. Тарабардина, О. А. Кресты «скандинавского» типа из раскопок в Новгороде / О. А. Тарабардина // Славяне и иные языци... К юбилею Натальи Германовны Недошивиной / ред. Н. И. Асташова. — М. : ГИМ, 2014. — С. 234—241. — (Труды ГИМ. Вып. 198).

5. Фехнер, М. В. Крестовидные привески «скандинавского» типа / М. В. Фехнер // Славяне и Русь. — М. : Наука, 1968. — С. 210—214.

6. Чуракова, А. Ю. Подвески-кресты «скандинавского типа» в контексте погребальной культуры Древней Руси XI—XII вв. / А. Ю. Чуракова // Élite ou Égalité... Северная Русь и культурные трансформации в Европе VII—XII вв. / отв. ред. Н. И. Платонова. — СПб. : Изд. дом «Бранко», 2017. — С. 159—177.

***Магалінскі Ігар Уладзіміравіч***,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
старшы навуковы супрацоўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела НПГКМЗ

*И. В. Магалинский*

## КРЕСТОВИДНАЯ ПОДВЕСКА «СКАНДИНАВСКОГО» ТИПА ИЗ МАТЕРИАЛОВ ИССЛЕДОВАНИЙ 2020 г. НА ВЕРХНЕМ ЗАМКЕ ПОЛОЦКА

*Представлены результаты исследования серебряной крестовидной подвески «скандинавского» типа, происходящей из материалов археологических исследований на территории Верхнего замка Полоцка. Отмечается, что подобные изделия появляются в X—XI вв., а их бытование следует связывать с элитарной дружинной культурой. Делается вывод, что находку первого на территории Беларуси большого серебряного креста «скандинавского» типа на Верхнем замке Полоцка следует считать признаком присутствия тут в X—XI вв. княжеской дружины, возможно скандинавского происхождения.*

***Ключевые слова:*** *ювелирное ремесло, изделия из цветных металлов, материальная культура, археология Полоцка.*

***Магалинский Игорь Владимирович***, кандидат исторических наук, доцент, старший научный сотрудник научно-реставрационного отдела НПИКМЗ.